# ВІКТАР ФРАНЦАВІЧ АЛЕКСАНДРОВІЧ

мастак, графік, стваральнік ілюстрацый да шматлікіх выданняў твораў класікаў беларускай літаратуры



Віктар Александровіч нарадзіўся 28 жніўня 1951 года ў звычайнай сялянскай сям'і ў вёсцы Слабодцы Гудагайскага сельсавета. З маленства любіў чытаць добрыя кніжкі і маляваць да іх карцінкі. Пасля заканчэння ў 1968 годзе Астравецкай сярэдняй школы, год працаваў на мясцовай аўтабазе № 4. У 1975 годзе скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (цяпер гэта акадэмія мастацтваў)., дзе навучаўся майстэрству ў вядомага беларускага мастака В. Шаранговіча.

Пасля заканчэння інстытута ў 1975 годзе Віктар Францавіч застаўся выкладаць на кафедры графікі, якую ў той час узначальваў яго настаўнік. Разам яны працавалі 6 гадоў, выхоўваючы новае пакаленне мастакоў. Шаранговіч лічыў Александровіча адным з самых таленавітых і здольных сваіх вучняў, які, дзякуючы уласнаму стылю, дадаў у кніжную графіку больш тонкай лірычнасці і каляровых спалучэнняў.

Віктар Александровіч у пэўнай ступені быў універсальным мастаком. Хоць і пачынаў са станкавай графікі, пазней перайшоў на кніжную. Ён віртуозна валодаў літаграфіяй, а таксама выкарыстоўваў складаныя спалучэнні матэрыялаў – гуаш, пастэль, акварэль, тэмперу – для стварэння кніжных ілюстрацый.

Ён быў неаднаразовым пераможцам і лаўрэатам шматлікіх творчых спаборніцтваў розных узроўняў — Дыплом І ступені на рэспубліканскім конкурсе «Мастацтва кнігі» за афармленне трылогіі Барыса Сачанкі «Вялікі лес» («Верасы, «Гнілое балота, «Маці»). За ілюстрацыю кнігі Міхася Лынькова «Міколка-паравоз» нашага земляка адзначылі за лепшае афармленне дзіцячай літаратуры.

За гэтыя і іншыя дасягненні Віктара Францавіча ў 1987 годзе прынялі ў Саюз мастакоў БССР, што неаспрэчна сведчыла пра прафесійнае прызнанне. Ён вельмі сціпла адносіўся да ўзнагарод, галоўным і самым значным лічыў трымаць кнігу са сваімі малюнкамі, якая нядаўна выйшла з друку.

Працяглы час наш зямляк працаваў у дзяржаўным выдавецтве «Юнацтва». Ён праілюстраваў больш за 70 выданняў, сярод якіх – «Белая знічка» Алеся Савіцкага (1983), «Станаўленне» Генрыха Далідовіча (1984), «Алімпіяда» Івана Пташнікава (1984), «Кепска будзе» Францішка Багушэвіча (1985), «Сымон-музыка» Якуба Коласа (1986), «Чайкі на хвалях» Івана Чыгрынава (1986), «Подых навальніцы» і «Людзі на балоце» Івана Мележа (1991), «Завеі і снежань (1995), зборнік беларускіх народных казак «Не сілай, а розумам» (1997) і многія іншыя.

Калегі Віктара Францавіча казалі: ён «вышываў на паперы». Таксама прыгадвалі, што мастак (напэўна, як і любы творчы чалавек) быў вельмі

патрабавальным да сябе. Аднойчы ён цалкам знішчыў амаль гатовую серыю графічных аркушаў з-за таго, што «яна была недастаткова жывой».

Таксама захаваліся сведчанні, што многія аднавяскоўцы мастака сталі прататыпамі класічных герояў кніг Коласа і Лынькова.

Менавіта з дзяцінства ў Віктара Францавіча сфарміравалася любоў да роднай зямлі і народных матываў, якія пазней праявіліся ў графіцы.

Адзіная прыжыццёвая персанальная выстава работ Віктара Францавіча на радзіме адбылася ў 1999 годзе ў Астраўцы ў раённай бібліятэцы. Яна стала своеасаблівай справаздачай перад землякамі. У аснове вернісажа – графічныя аркушы, акварэлі, некаторыя работы да паэмы «Сымон-музыка». Дарэчы, да гэтага часу ў бібліятэцы захоўваюцца арыгіналы ілюстрацый да «Міколкі-паравоза» і «Курачкі-рабы», якія трапілі сюды са Слабодкаўскай бібліятэкі.

Пры напісанні ілюстрацый да «Сымона-музыкі» ён перадаваў вобразы з дзяцінства. Дэталі адзення, будынкаў, музычных інструментаў Александровіч «спісваў» з рэальных прадметаў, якія бачыў у Слабодцы і суседніх вёсках.











Віктар Францавіч казаў, што ў адным пахіленым плоце ці старой яблыні ў яго роднай вёсцы нашмат больш беларускасці, чым ва ўсіх парадных пейзажах. «Гэта філасофія вернасці караням зрабіла яго адным з самых праўдзівых графікаў свайго пакалення», – упэўнена ўдзельніца.

Мяркуюць, што мастак планаваў стварыць вялікі грунтоўны цыкл работ, прысвечаных роднай старонцы, але, на жаль, гэтай задуме так і не было наканавана ўвасобіцца ў жыццё.

Віктар Францавіч памёр 20 чэрвеня 2001 года. Пахаваны на Міншчыне. Арыгіналы яго твораў знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, у фондзе Беларускага саюза мастакоў, у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры, у прыватных калекцыях.

Сваё, астравецкае": аўтар ілюстрацый
да "Міколкі-паравоза" і іншых выданняў
наш зямляк Віктар Александровіч
Алена Гануліч
17.04.2026

Бібліяграфія

1.Віктар Францавіч Александровіч [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://be.wikipedia.org/wiki/Віктар Францавіч Александровіч. – Дата доступу : 22.08.2016.

2.Віктар Александровіч // Тумаш, В. Культура зямлі Астравецкай: Асобы і творы: біягр. даведнік / Вера Тумаш. – Мінск : "Беларускі кнігазбор", 2000. – С. 3.

3.Мальдзіс, А. Александровіч Віктар / Адам Мальдзіс // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Астравецкага раёна / рэд. кал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. ; маст. Э. Э.Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 2004. – С. 446.